Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»




*З вопыту работы па краязнаўству*

# Слаўныя землякі

**Укладальнік – Вайцяховіч А.В.,**
**намеснік дырэктара**

# УВОДЗІНЫ

Наўрад ці можна прызнаваць правільны падыход, калі ўвага краязнаўцаў-следапытаў засяроджваецца на зборы і даследаванні матэрыялаў аб жыццёвым шляху толькі знакамітых землякоў або іншых вядомых асоб, звязаных з іх рэгіёнам. Важна, каб на першы план выступала вывучэнне лёсаў простых людзей, гісторыя “звычайных” сем'яў, штодзённасць падзей мінулага і сучаснасці. Адзін з напрамкаў краязнаўства – вывучэнне канкрэтных чалавечых лёсаў, у першую чаргу “блізкіх” людзей – сваякоў, землякоў, вывучэнне паўсядзённасці, жывога жыцця з яго кранальнымі падрабязнасцямі. Знаёмячыся з жыццём землякоў, дзеці знаходзяць у іх падставы для гонару за сваю зямлю і яе людзей, на чым і грунтуецца любоў да Айчыны, жаданне служыць ёй, працаваць на карысць гэтых людзей.

Вучні-краязнаўцы нашага аб’яднання ўжо сабралі багаты матэрыял пра людзей, на першы погляд, звычайных, простых, але настолькі цікавых, што без іх ужо немагчыма ўявіць гісторыю нашага горада і раёна. Таму што гэта людзі, якія ствараюць і працягваюць гэту гісторыю, уносяць у яе штосьці самабытнае і непаўторнае.

Менавіта з такіх людзей павінны браць прыклад нашы навучэнцы, на іх раўняцца, каб ствараць і памнажаць багацці нашай зямлі, каб не страціць годнасці працалюбівага беларуса, каб упрыгожваць нашу зямлю славай і дасягненнямі, ды не толькі працоўнымі, але і духоўнымі…

Жыццё чалавека напаўняецца паэзіяй. Яна звініць у паветры, меладычна пераліваецца ў вершалінах дрэў векавых дубоў, мройна вісіць над затокамі, плаўна цягнецца ўздоўж рачных берагоў, сцелецца над квяцістымі лугамі… Уся прастора – гэта паэзія.

Кожны куточак беларускай зямлі слаўны сваімі самымі рознымі талентамі. Не выключэнне – і вёска Таргуны, наша маленькая вёсачка Докшыцкага краю. Тут, як і паўсюдна, годна жывуць і працуюць на сваю карысць і на карысць грамадству людзі розных прафесій. У гэтым маляўнічым краі заўсёды было кім ганарыцца. Гэта зямля нараджала не толькі сейбітаў і аратых, але і вядомых асветнікаў, прадстаўнікоў творчых прафесій.

Надзвычайна цудоўная гэта зямля, якая стварала таленавітых людзей. Адны – таленавітыя сыны і дочкі – нібы птушкі, разляцеліся з родных гнёздаў, але на ўсё жыццё захавалі ўдзячнасць зямлі маленства. Другія, нарадзіўшыся тут, сваім талентам упрыгожваюць мілы куток. Леаніла Усцінаўна Чарняуская – гэта мясцовая паэтка, вершы якой – сапраўдная ода роднаму краю.

**Леаніла Чарняўская – наша слаўная зямлячка.**

Мэты і задачы:

1. Пазнаёміць вучняў з біяграфіяй пісьменніцы, асаблівасцямі яе творчасці.
2. Зацікавіць вучняў асобай пісьменніцы і яе творамі.
3. На аснове матэрыялаў, сабраных за папярэднія гады, паказаць, як ушаноўваецца імя зямлячкі.
4. Развіваць у вучняў мастацкі густ і цікавасць да культурнай спадчыны беларусаў Докшыцкага раёна.
5. Выхоўваць пачуццё гонару за свой край і яго людзей, фарміраваць на гэтым грунце патрыятычныя пачуцці.
6. Прывіваць навыкі назіральнасці, жаданне збіраць матэрыялы пра славутых землякоў з перыёдыкі.
7. Выхоўваць эстэтычны густ і любоў да прыроды і да братоў нашых меншых.

Форма правядзення: *Падарожжа ў часе і прасторы.*

План падарожжа:

1. Прыпынак “Геаграфічны”.
2. Прыпынак “Літаратурнага адкрыцця”.
3. Прыпынак “Гістарычна-гасцінны”.
4. Прыпынак “Лірычны”.
5. Прыпынак “Успамінаў”.
6. Прыпынак “ Займальны”.
7. Прыпынак “Эмацыянальны”.
8. Прыпынак “Памяці”.

Абсталяванне:

1. Партрэты Л.Чарняўскай, Ю.Свіркі, А.Ставера, П.Панчанкі, А.Кірвеля, Ф.Палачаніна, І.Стадольніка.
2. Матэрыялы папкі-капілкі “Леаніла Чарняўская – наша слаўная зямлячка”.
3. Зборнікі апавяданняў “Казёл Мэка і Кудла”, “Апавяданні”.
4. Ілюстрацыі да твораў пісьменніцы.

5. Гульнёвы матэрыял .

6. Выпуск газеты “Роднае слова”, прысвечаны Л.Чарняўскай.

7. Пісьмы Г.Гарэцкай – дачкі пісьменніцы.

8. Карта Віцебскай вобласці і Докшыцкага раёна.

9. Кніга “Памяць”. Докшыцкі раён.

10. Герб Докшыцкага раёна.

11. Відэа- і аўдыёзапісы беларускіх народных песень.

Афармленне:

На дошцы напісаны эпіграф занятку і план падарожжа.

Дадатковы матэрыял для дзяцей:

1. Маршрутны ліст.
2. Буклет “Леаніла Чарняўская”.
3. Апавяданне Л.Чарняўскай “Петручок”.
4. Карткі-памяткі біяграфіі пісьменніцы.
5. Крыжаванка “Леаніла”.
6. Словы беларускай народнай песні “Туман ярам”.

Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена,
Мы не дзікай травы самарослыя парасткі.
У глыбінях зямлі, гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані – з вузлякамі ўпартасці.

Н.Гілевіч

Ход заняткаў:

*Уступнае слова кіраўніка аб’яднання:*

– Дзеці, вы любіце падарожнічаць?

Калі так, то мы з вамі адправімся ў падарожжа, каб пазнаёміцца з творчасцю і асобай дзіцячай пісьменніцы Леанілы Чарняўскай.

Падарожжа наша будзе ў часе і прасторы. Як вы разумееце гэта? А што яшчэ трэба для пленнага адпачынку, адкажыце, калі ласка.

Так, павінен быць добры настрой і жаданне адкрыць для сябе нешта новае. Звярніце ўвагу на свой маршрутны ліст, які вам спатрэбіцца ў часе адпачынку.

І так, паглядзім адзін аднаму ў вочкі, усміхнёмся і пажадаем шчаслівай дарогі.

Шчаслівага адпачынку і цікавых вам адкрыццяў!

***1. Прыпынак "Геаграфічны".***

– Дзеці, паглядзіце на карту нашай Беларусі. Яна не такая і вялікая, наша краіна. Але колькі талентаў, рупліўцаў роднага слова, працавітых і дбайных людзей, вучоных, касманаўтаў дала свету Беларусь.

А на поўначы рэспублікі знаходзіцца наш Докшыцкі раён. Ён быў некалі размежаваны рознымі ўладамі: да 1939 года адна частка раёна, у тым ліку і наша тэрыторыя, дзе мы жывём, была пад уладай Польшчы. Жылося цяжка, але бедната і галеча не сталі перашкодай нараджэнню таленавітых людзей. Докшыцкая зямля нарадзіла і выхавала многа дзеячоў літаратуры, культуры і мастацтва. Сярод іх пісьменнікі і паэты: Юрась Свірка, Алесь Ставер, Іван Стадольнік, Анатоль Кірвель (ў Бягомлі вучыўся Пімен Панчанка), кампазітары: Нестар Сакалоўскі – аўтар Дзяржаўнага Гімна Рэспублікі Беларусь, Эміль і Станіслаў Наско, мастакі: Надзея Хадасевіч-Лежэ, Павел і Міхаіл Барздыкі, г.Докшыцы – радзіма мастакоў сям'і Маркаўцоў (Віктар Маркавец, Валянціна Маркавец-Бартлава, Галіна Крываблоцкая). А вёска Таргуны стала месцам нараджэння дзіцячай пісьменніцы Леаніла Чарняўскай – жонкі пісьменніка Максіма Гарэцкага.

(Кіраўнік паказвае партрэты кожнай асобы і месца іх нараджэння на карце. На карце Докшыцкага раёна пазначаны месцы нараджэння вядомых людзей: вёскі Маргавіца, Янкі, Таргуны, Вітунічы, Чаркасы, г.п.Бягомль, г.Докшыцы).

***2. Прыпынак "Літаратурнага адкрыцця".***

А зараз паслухайце апавяданне Леанілы Чарняўскай “Петручок”. Дзеці, у кожнага з вас ёсць тэкст гэтага апавядання. Калі сустрэнуцца невядомыя словы ці выразы, падкрэсліце іх у тэксце, а потым я растлумачу іх значэнне.

*(На фоне музыкі кіраўнік чытае твор).*

(*Л.Чарняўская. Апавяданні. Мн.:Маст..літ., 1983, с.122)*

*Невялічкае заданне:*

**Я**

**Бачу**
**Чую**
**Адчуваю**

Пытанні да апавядання:

- Як, на вашу думку, адносіцца аўтар да свайго героя?
- Які настрой выклікае ў вас апісанне прыроды ў апавяданні?
- Ці магло такое быць на самай справе з малым хлопчыкам?
- Успомніце выпадкі, падобныя на гэты, з вашага маленства.

(Дэманструюцца ілюстрацыі да апавядання)

– Цікавае апавяданне? Тады мы павінны будзем не толькі слухаць , але і самі прачытаць творы дзіцячай пісьменніцы Леанілы Чарняўскай.

(Кіраўнік прапануе зборнікі апавяданняў “Апавяданні” і “Казёл Мэка і Кудла”).

***3. Прыпынак “Гістарычна-гасцінны”.***

– Мы, дзеці, вернемся ў часе на два стагоддзі назад, каб даведацца пра гістарычныя ўмовы і тыя падзеі, якія звязаны з жыццёвым шляхам пісьменніцы.

*Калісьці Я.Купала скардзіўся, што ў Беларусі няма паэтаў. З гэтым пагадзіцца можна часткова. Малавата іх было ў параўнанні з нашым часам, але ўжо нарадзілася і проза, і паэзія , і дзіцячай літаратура. Адной з пачынальніц беларускай дзіцячай літаратуры, сучасніц Янкі Купалы ў маладыя гады, з’яўляецца наша зямлячка Леаніла Усцінаўна Чарняўская.*

*Нарадзілася Леаніла Чарняўская 16 лістапада 1893 года ў вёсцы Таргуны Докшыцкага раёна ў сялянскай сям'і. Бацька яе, Усцін Усцінавіч, арандаваў частку зямлі то ў аднаго пана, то ў другога. Ён добра чытаў і пісаў па-руску. Маці, Аміля Антонаўна, чытаць умела, а пісала слаба. У маладосці яна служыла хатняй швачкай у паноў. Сям'я была вялікая – шасцёра дзяцей. Пастаяннага кута не мелі, пераязджалі з месца на месца.*

*У 1900 годзе заможны матчын дзед купіў у Віленскага Зямельнага банка ў крэдыт фальварак Касарэўшчыну на Дзісненшчыне і даў мнагадзетнаму сыну, каб гаспадарыў там і выплачваў банкаўскі доўг.*

*Вялікіх дастаткаў у сям'і не было, але стараліся вучыць і дачок.*

*У 1902 годзе дзевяцігадовая Леаніла Чарняўская вытрымала на "выдатна" уступныя экзамены ў першы клас Вышэйшага Марыінскага вучылішча (тыпу гімназіі) у Вільні. Дапамагала надзвычайная памяць, якая захавалася на ўсё жыццё. Лёгка запаміналася вершы не толькі на роднай, але і на нямецкай і французскай мовах. Разумела матэматыку, але больш любіла гуманітарныя навукі. У старэйшых класах выкладаў Фядот Андрэевіч Кудрынскі (былы настаўнік Я.Коласа, які вучыў разумець і любіць творы рускіх класікаў.*

*З шостага класа мела свой заробак і займалася рэпетытарствам.*

*Закончыла вучылішча ў 1910 годзе і была прызначана настаўніцай у сяло Залессе Дзісненскага павета на Віленшчыне. Школа была пачатковая, на 4 аддзяленні. Вучняў хадзіла многа. З дальніх вёсак прыязджалі на цэлы тыдзень, жылі пры школе.*

*Вечарамі прыходзілі ў школу дарослыя дзяўчаты і хлопцы, вадзілі карагоды, спявалі, наладжвалі вечарыны. Дзяўчат вучыла розным відам рукадзелля.*

*1 студзеня 1919 года ў Вільні адкрылася першая беларуская гімназія, куды запрасілі працаваць Леанілу Чарняўскую настаўніцай пачатковых класаў. У гэтым жа годзе выйшла замуж за беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага, выкладчыка беларускай літаратуры гімназіі і настаўніцкіх курсаў.*



Л.Чарняўская



Леаніла Чарняўская і Максім Гарэцкі з дзецьмі. 1923 г.



Леаніла Чарняўская з дачкой Галінай і сынам Леанідам. 1925 г.

*У 1919 годзе выйшла чытанка для дзяцей “Родны край”, апавяданне “Мікітка” і зборнік “Дзіцячыя гульні”, якія напісала Л.Чарняўская. У зборнік “Дзіцячыя гульні” увайшлі 27 гульняў: “Камянькі”, “Прарок”, “Барада”, “Гарбуз гнілы”, “Шавец”, “Жарты і зайцы”, “Грушка” і іншыя.*

*Пазней выходзілі чытанкі для першага, трэцяга і чацвёртага гадоў навучання. Выбіраючы для іх вершы, кароткія апавяданні ці ўрыўкі з большых твораў, сама лепей уведала і палюбіла творчасць беларускіх пісьменнікаў: Ф.Багушэвіча, Цёткі, М.Багдановіча, Я.Купалы, Я.Коласа, З. Бядулі. Складаючы чытанкі, уключала ў іх урыўкі з апавяданняў Чэхава, Гаршына,*

*Маміна-Сібірака, Караленкі, Серафімовіча, перакладала з французскай, польскай моў.*




Тытульны аркуш кнігі Ш. дэ Костэра “Тыль Уленшпігель”, перакладзенай на беларускую мову Л.У.Чарняўскай.

*У 1923 годзе сям’я пераязджае ў Мінск. У 1923-32 гадах займалася перакладамі, пісала апавяданні. Выходзяць яе творы для дарослых: “Падарожніца”, “Бяздзетуха”, “Валуй”, “Папова батрачка”, “Веснавыя хмаркі”. Друкавалася ў дзіцячым часопісе “Іскры Ільіча”, у газеце “Піянер Беларусі”. Асобнымі кніжкамі былі надрукаваны апавяданні “Варка”, ”Кот Знайдзён”, “Андрэйка”, зборнік “Лявонка”, “Сталевы конь”.*




Вокладкі кніг Л.У.Чарняўскай

*Шмат апавяданняў пра жывёл напісала аўтарка, дзе выхоўвае добрыя, спагадлівыя адносіны да іх.*

*У сувязі з высылкай мужа з 1932 года жыла ў Вятцы (пазней г.Кіраў), г.п. Пясочня Заходняй вобласці (цяпер Калужская вобл.). У 1932 –35, 1938-47 гг. працавала выхавацелькай ў дзіцячым садзе г. Кірава. У 1943 годзе Леаніла Усцінаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай выдатніка дашкольнага выхавання, а ў 1946 – медалём “За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.”*

*18 лютага 1944 г. загінуў на фронце сын Лёня, цяжка было перамагаць няўцешнае гора. У 1947 годзе Леаніла Чарняўская выходзіць на пенсію, пераязджае да дачкі Галіны ў Ленінград.*



*Л.Чарняўская вельмі хараша спявала, голас мела моцны, чысты, мілагучны. Яе нават запрашалі паехаць у турнэ па Беларусі выконваць народныя песні. Але спявала толькі больш для сябе і з моладдзю. Любімыя песні былі “Рабіна, рабіначка...”, “Як па мору, мору сіняму”.*

*У вольны час Л.Чарняўская любіла вышываць. Яе футляры для дробных рэчаў, газетніцы, дарожкі былі аздоблены прыгожымі вышыўкамі. З ранніх гадоў яна добра ведала розныя віды вышыванак: гладзь, крыжыкі. Любіла арнамент, аплікацыі. Многа вышывала ў 60-я гады ў Ленінградзе.*

*Фотаздымкі яе вышыванак друкаваліся ў часопісе “Мастацтва Беларусі” у 1988 годзе.*



Л. Чарняўская. Вышываныя дарожкі. 1963 – 1968.



Л.Чарняўская. Дыванок. 1963 – 1968.





*Апошнія 8 гадоў жыцця была прыкавана хваробай да ложка, але не страціла цікавасці да ўсяго навакольнага, любіла людзей, шмат чытала.*

*26 верасня 1976 года Л.Чарняўская памерла. Пахавана ў Ленінградзе на Паўднёвых могілках.*

*Апошняя кніга Леанілы Чарняўскай "Апавяданні" выйшла ў 1983 годзе, убачыць якую ёй не давялося.*







Сучасныя вокладкі кніг Леанілы Чарняўскай.

*У часе і прасторы мы пабывалі. А дзе нашы госці? Дзякуючы сучаснай тэхніцы, да нас прыйдуць у госці члены гуртка “Спадчына” Таргуноўскай школы. Паслухайце, як спяваюць адну з любімых песень Л.Чарняўскай дзеці.*

( Відэазапіс выступлення дзяцей. Гучыць песня “Туман ярам”).

**4. *Прыпынак “Лірычны”***
***(практыкум).***

– Мы з вамі праслухалі песню “Туман ярам”. Гэта лірычная песня, як і іншыя, дзе ўспамінаюцца дрэвы: дуб, вярба, рабіна, любіла спяваць Леаніла Чарняўская.

А якое ж падарожжа без сапраўднай песні?! Давайце развучым гэту песню з вамі.

Акрамя песень, Леаніла Чарняўская сабрала і запісала больш як 30 народных дзіцячых гульняў.

Мы развучым з вамі гульню “Варажба”.

А зараз я раскажу вам пра гульню-карагод “Грушка”, якая была распаўсюджана сярод моладзі ў канцы XIX стагоддзя.

Бачыце, прайшло колькі гадоў, а гульня жыве і зараз.

Гуляюць дзяўчаты. Яны выбіраюць адну з удзельніц – “грушку”, утвараюць вакол яе карагод, танцуюць і спяваюць:

*Да ўжо грушку пасадзілі,*

*А я малодзенька, скачу-пляшу!*

*Да ўжо грушку пара палівацi,*

*А я малодзенька, скачу-пляшу,*

*Да ўжо грушка ў пупышкі бярэцца*

*і г.д. праспяваўшы аб тым,што “грушка лісцік распусціла”, “зацвітае”, “адцвітае”, “у завязь бярэцца”, “паспявае” і “ўжо грушку пара шчыпаці”, карагод рассыпаецца, і ўсё пачынаюць жартаўліва шчыпаць “грушку”. На гэтым гульня заканчваецца.*

## 5. *Прыпынак “ Займальны”.*

– Дзеці, на гэтым прыпынку нам прыйдзіцца папрацаваць: веды, якія вы атрымалі ў час падарожжа, тут спатрэбяцца кожнаму. Можаце звярнуцца да матэрыялаў, якія ёсць у кожнага.

*Крыжаванка “Леаніла”*

Дапішыце ўласныя назоўнікі, якія звязаны з жыццём сям’і Леанілы Чарняўскай.

1. Імя сына Л.Чарняўскай.
2. Горад, у якім жыла ў апошнія гады пісьменніца.
3. Імя мужа Л.Чарняўскай.
4. Горад, дзе жыла Л.Чарняўская.
5. Імя маці пісьменніцы.
6. Імя дачкі Л.Чарняўскай.
7. Назва вёскі, дзе працавала настаўніцай пісьменніца.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | Л | | | | | | | |
| 2. | | | Е | | | | | | | |
| 3. | | | А | | | | | | | |
| . 4. | | | Н | | | | | | | |
| 5. | | | І | | | | | | | |
| 6. | | | Л | | | | | | | |
| 7. | | | А | | | | | | | |

*адказы*

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | | | **Л** | **Е** | **А** | **Н** | **І** | **Д** | | |
| **2.** | | **Л** | **Е** | **Н** | **І** | **Н** | **Г** | **Р** | **А** | **Д** |
| **3.** | | **М** | **А** | **К** | **С** | **І** | **М** | | | |
| **4.** | **М** | **І** | **Н** | **С** | **К** | | | | | |
| **5.** | **А** | **М** | **І** | **Л** | **Я** | | | | | |
| **6.** | **Г** | **А** | **Л** | **І** | **Н** | **А** | | | | |
| **7.** | | **З** | **А** | **Л** | **Е** | **С** | **С** | **Е** | | |

***6. Прыпынак “Эмацыянальны”.***

– Дзеці, звярніце ўвагу на маршрутныя лісты. Як бачыце, наша падарожжа заканчваецца. Я хачу ведаць з якім настроем мы прайшлі наш маршрут, як адпачылі, што новага для сябе адкрылі?

Перад вамі астравы.

*(Падвядзенне вынікаў. На дошцы намаляваны і падпісаны астравы)*



– Паглядзіце на іх уважліва, падумайце, да якога вострава вы прыйшлі. Кожны абазначце сваё імя на выбраным востраве. Пастарайцеся даць тлумачэнне свайго выбару.

*Гурткоўцы выказваюць свае ўражанні аб занятку, аб сваім знаёмстве з Леанілай Чарняўскай. Выбіраюць свае астравы, тлумачаць свой выбар.*

*Кіраўнік звяртае ўвагу на эпіграф і мэты заняткаў. Вядзецца абмеркаванне выбранага эпіграфа і мэтаў.*

***7. Прыпынак “Памяці”.***

– Напэўна, сама гісторыя зрабіла так, каб сённяшняя з вамі сустрэча адбылася 28 верасня, 40 год таму ленінградская зямля дала вечны прытулак целу Леанілы Чарняўскай. Нагадаю, што памерла яна 26 верасня 1976 года, а была пахавана 28 верасня.

Гэты прыпынак Памяці хай сведчыць аб тым, што імя гэтай жанчыны вялікага сэрца і мужнасці жыве і сёння на вуснах яе землякоў, у маладога пакалення беларусаў. На яе творах мы будзем працягваць вучыцца дабрыні, узаемапавазе, любові да Бацькаўшчыны і роднага слова.

А вось які верш прысвяціла памяці Леанілы Чарняўскай Аўгіння Кавалюк.

*(Кіраўнік запальвае свечку каля партрэта Леанілы Чарняўскай, дзеці кладуць кветкі)*

*Аўгіння Кавалюк*

***Памяці Леанілы Чарняўскай***

*I*

*Дзень заспявае – ночка заплача,*

*Сляза сцякае крывёй гарачай...*

*Што твае раны зварушыла?*

*Ці перад небам ты саграшыла*

*І перад Богам, і перад людам*

*Была натхнёным прыгожым цудам,*

*Была сумленнай жонкай і маці,*

*Цярпліва ўмела чакаць, кахаці...*

*Лісты пісала за краты мужу,*

*Заўсёды ўмела трымацца дужай.*

*Адкуль займала такія сілы –*

*Мужа і сына шукаць магілы?*

*Ніхто не бачыў, як сумавала,*

*У сэрцы збалелым іх пахавала,*

*Каб на Нябёсах і ў вёсны, і ў зімы*

*Не разлучацца ніколі з імі.*

*II*

*Дзе мяккі снег на кронах хвой бялее,*

*Ёсць на Паўднёвых могілках алея...*

*Над помнікам схіліліся бярозы,*

*Хаваючы жаночы боль і слёзы.*

**Дадатковы матэрыял**

Л.Чарняўская

**Петручок.**

Маленькі яшчэ хлопчык Петручок. Валаскі чорныя, вочкі чорненькія, зусім як жучок. Як жучок і поўзае: у кожную шчыліну прашчэміцца. Тут быў, тут няма.

Тры гады яму скончылася, стол перарос і шнырыць усюды.

Пакінула яго матка ў хаце.

– Сядзі, – кажа, – не чапай нічога, на вуліцу не вылазь, бо брудна яшчэ дужа пасля ўчарашняга дажджу. Сядзі, – кажа, – а я хуценька вярнуся.

І пайшла на агароды.

Хто ж гэта ўцерпіць, каб аднаму сядзець у хаце, калі на дварэ так ясна, так вясёла!

Падняўся на дыбачкі Петручок, дастаў рукою клямку, паляпаў, паляпаў, паціснуў дзверы; дзверы паддаліся, зрабілася шчыліна, праз якую праціснуўся хлопчык.

Ой, і добра ж на панадворку! Сонца свеціць, грэе, слепіць вочы. Вераб'і, шпакі проста падурэлі: крычаць, звіняць, мітусяцца, аж пер'е з іх сыплецца. Гразі тэй – толькі званне; дзе-нідзе лужынкі засталіся. “Тут буду гуляць, – вырашае малы. – Не пайду на вуліцу”.

Босымі ножкамі цягнецца ён да лужынкі. Мочыць спачатку пальцы на нагах, потым усёй нагой слізгаецца па дне, муціць ваду, падымаючы пальцамі гразь са дна лужыны. Пакуль усе лужыны абышоў – абрыдла гэткая работа. Ці няма чаго цікавейшага?

Зірнуў туды-сюды.

Пад паветкаю, на ўзгорачку, на сухім месцы, куды і сонца дастае, прытулілася курыца з кураняткамі. Сядзіць, распусціўшы пер'е, схавала пад сябе сваіх малых, такіх жа непаседлівых, як Петручок. Увесь час ні сабе, ні матцы спакою не даюць. То той, то іншы з-пад крыла выціснецца, на спіну матчыну лезе. Сварыцца і просіць іх курыца слухацца, то квохкае ласкавенька,

то кырхае нездаволена. Зацікавіўся сям’ёй Петручок. Так захацелася яму, малому, пагуляць з маленькімі пісклянятками. Хітры ён хлапчук. Разумее, што калі пабяжыць раптоўна да курыцы, яна ўсхопіцца і ўцячэ з усёю сям’ёю. Ці ж яму дагнаць яе?

Паціхеньку падыходзіць ён. Курыца і бачыць яго, ды ёй і не ў галаве, што такога жука трэба баяцца. Кырхнула толькі крыху, калі зусім блізка падсуседзіўся хлопчык.

Ён рукамі махае, цягне руку павольна пад крыло квактухі. Дастаў адно маленькае беленькае кураня, пацешыўся з яго, ды тут і другое хочацца дастаць.

Пасадзіў першае на зямлю, далонькай злёгку прыціснуў, палез па другое. Пакуль справіўся, глядзіць – уцякло першае піскляня.

І ўсё так. Дастане, пасадзіць, насварыцца, як, бывае, матка на яго: “Сядзі, сядзі, а то дам я табе”.Не слухаюцца яго кураняты, уцякаюць пад крылы квактухі.

Узлаваўся Петручок.

– Будзеш, будзеш сядзець?!

*Як схапіў цяпер адно абедзвюма ручкамі, паціскаў... Не трапыхаецца кураня, а курыца, дурная, толькі кырхае і сядзіць, як у зямлю ўліпшы, не бароніць сваіх дзяцей.*

*Цешыцца Петручок, не ўцякаюць кураняткі больш, ножкамі толькі каторы таргане; гладзіць іх ручкамі хлопчык, пільна-пільна ў іх углядаецца.*

*Аж раптам нехта балюча шлоп-шлоп па галаве, па плячах. Гэта сястра Верка каршуном на свайго малога брата наскочыла.*

*– Ах ты, кацяня дурное! Усіх куранят перавёў! – і як бы ён быў сапраўды малым кацянём, падняла яго за карак і ўкінула ў хату. Хату знадворку зашчапіла на клямку і палачкай заторкнула.*

*Плача ў хаце Петручок. Ціха хліпае. І сам ужо не рад сваёй гульні; і маткі боязна, і куранятак маленькіх шкада: “Бо бегаць больш не будуць”, – казала Верка.*

*Верка недзе размінулася з маткай, і тая ўвайшла ў хату, нічога не ведаючы аб Петручковых штуках.*

*Падзівілася маці, хто дзверы ў хаце зашчапіў, ўвайшла і гукнула сынка:*

*– Ці ты тут, сынок?*

*Петручок маўчаў і хліпаў.*

*– Чаго ты плачаш, верабейка мой маленькі? Хто цябе запёр у хаце?*

*– Верка!..*

*– Ай дам я гэтай Верцы, катка майго  маленькага крыўдзіць! Хадзі, пашкадую цябе.*

*Але хлопчык не ішоў. Чуў, што не варты матчынай ласкі, а прызнавацца ў шкодзе не хацелася.*

*Маці падышла да яго ў куточак, дзе ён сядзеў, абцерла яму слёзкі, прыгладзіла пальцамі валаскі на галаве.*

*– Песці, мама, песці гэтага дурня. Усіх куранят перадушыў, а ты яго шкадуеш! – падкруцілася ў хату Верка.*

*– Якіх куранят?*

*– Ідзі паглядзі, зірні пад паветку!*

*Выбеглі абедзве.*

*Прыдушаныя кураняты ўжо крыху ачухаліся, да курыцы пацягнуліся.*

*Пажурыла маці сына. Усцешыўся ён, што піскляты жывымі засталіся і пацягнуўся за маткай на агарод, дапамагаць ёй буракі садзіць.*

Невялікі з яго памочнік: ножкамі баразёнку прытоптвае, каб раўней усім было хадзіць. Але работа гэтая вымагае ад яго самай пільнай увагі. Трэба глядзець, каб не заваліцца на край грады ды не папсаваць ужо матчынай работы.

## Беларускія народныя песні

### Туман ярам

Туман ярам, ярам-даліною
Туман ярам, ярам-даліною.
За туманам нічога не відна,
Толькі відна дуба зелянога.
Пад тым дубам крыніца стаяла,
Там дзяўчына ваду набірала.

Ды ўтапіла залато вядзерца,
Засмуціла казакова сэрца.
А хто тое вядзерца дастане,
Той са мною на ручніку стане.
Хлопец тое вядзерца дастане,
Ён з табою на ручніку стане.

### Вішанька-чарэшанька

Вішанька-чарэшанька
Ягадак не мае,
А хто ў прымах не бываў,
Той гора не знае.     2 р.
- А я ў прымах пабываў,
Та й усё гора знаю:
Кулачэнкі пад бачэнькі –
Так спаці лягаю.    2 р.
Вот паехаў прымачок
У поле араці,
Ды забыўся небарака
Хлеба, солі ўзяці.    2 р.

Арэ, арэ цэлы дзень,
На шлях паглядае:
Усе жонкі абед нясуць,
А мая не дбае.    2 р.
Як прынесла на абед
Лебяды без солі, -
Адвярнуўся ды заплакаў,
І сказаў: - Даволі.    2 р.
Вішанька-чарэшанька
Ягадак не мае,
А хто ў прымах не бываў,
Той гора не знае.    2 р.

## **Дубочак зялёненькі**

*(Прыпеў паўтараецца з другім радком кожнай страфы)*

Дубочак зялёненькі,
Іванка малодзенькі
Ой, лі-люлі, ой, лі, ой люлі,
Іванка малодзенькі.

Іванка малодзенькі
Ідзе невясёленькі.

- Чаго, Ваня, журышся,
Чаго ты нахмурыўся?

- Ой, як мне вясёлым быць,
Ой, як жа мне не тужыць?

Усе мае таварышы
Даўно пажаніліся.

А я маладзюсенькі
Хаджу халасцюсенькі.

- Іванька ідзі дамоў
Душы не губі сваёй.

Адна ў цябе ўлюбёна,
Яшчэ не зашлюблена.

Бяры ты нясмелую
За ручаньку белую.

Вядзі ў сваю хатачку,
Пацеш мамку, татачку.
Ой, лі-люлі, ой, лі, ой, люлі
Пацеш мамку, татачку.

**Рабіна, рабіначка...**

– Рабіна, рабіначка,
Рабіна мая!
Чаму ж ты, рабіначка,
Рана адцвіла?
Дзяўчына, дзяўчыначка,
Дзяўчына мая!
Чаму ж ты, дзяўчыначка,
Засмуцілася?
– Ой, не ў тую порачку
На свет я прыйшла;
Маці, не падумаўшы,
Замуж аддала,
Дый у тую вёсачку,
У невядомую,
У чужую сямеечку,
У невясёлую.
Дальняя староначка
Без ветру сушыць,
Няродны татулечка
Без віны журыць.
Вой, жыву гадочак я,
Жыву я другі,
А на трэцім годзіку
Занудзілася.
Абярнуся птушачкай,
Шэрай зязюляй,
Палячу я молада,
К мамачцы сваёй.
Ой, пайду, ой, сяду я,
У вішнёвым саду,
Запяю я песеньку
Жаласну сваю,
Я думала, думала,
Што мамачка спіць,
Ажно мая мамачка
У сянёх стаіць
Ды будзіць нявестачак:
“Ластачкі мае,
Паслухайце птушачку,
Што у садзе пяе!
Што гэта за птушачка
Жаласна пяе,
Адкуль гэта птушачка
Прычыты бярэ?
Калі наша дзіцятка –
Ляці к нам на двор.
А зязюля шэрая –
Ляці ў шчыры бор!”
Не дачула дочанька
Матчыных размоў,
Паляцела дочанька
Ды ў шчыры бор.

## Літаратура


1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996-2003.
2. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993-2003.
3. Газета “Родныя вытокі”. – 2008 – 2012.
4. Легенды і паданні Докшыцкага краю. – Докшыцы, ЦДТ, 2001. – 68 с.
5. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна: рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.